**С.В.Зыгмантовіч**, *дацэнт*
**Н.У.Клімянкова**, *дацэнт*

# ФОРМЫ СТЫМУЛЯВАННЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Сярод фактараў, ад якіх залежаць вынікі самастойнай работы студэнтаў, безумоўна, не апошняе месца займае іх адпаведная матывацыйная накіраванасць. Стымуляванне самастойнай работы на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) БДУ культуры і мастацтваў ажыццяўляецца ў розных кірунках. Усё часцей ужываюцца формы, якія патрабуюць даследчага, творчага падыходу. Выкарыстоўваюцца заданні з улікам іх складанасці. Па асобных тэмах некаторых курсаў прадугледжаны самакантроль студэнтаў за засваеннем матэрыялу. Гэта значыць, што пэўныя паўнамоцтвы выкладчыка дэлегі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

руюцца студэнтам для самакантролю і самакарэкцыі, што вельмі важна ў мэтах актывізацыі ўнутраных механізмаў самаразвіцця асобы студэнта.

Важнае значэнне мае зваротная сувязь паміж выкладчыкамі і студэнтамі. З гэтай мэтай праводзіцца анкетаванне. Апошні раз былі апытаны 72 студэнты ФІДК: 37 – трэцяга і 35 – чацвёртага курсаў. На пытанне: "Колькі часу вы звычайна траціце на самастойную работу?" – найбольшая колькасць студэнтаў III курса назвалі 2,5 гадзіны. Студэнты чацвёртага курса часцей называлі 3 гадзіны.

Апытаным было прапанавана адказаць, у якой ступені стымулюе іх самастойнасць падрыхтоўка да лабараторных работ, семінараў, пошукавых заданняў, тэст-апытанняў, рэфератаў, дакладаў, курсавых работ. На думку студэнтаў, самастойнаму набыццю ведаў у найбольшай ступені спрыяюць падрыхтоўка рэфератаў і курсавых работ. Студэнты чацвёртага курса ацэньваюць іх стымулюючы патэнцыял некалькі вышэй, чым трэцякурснікі. Навучэнцы адзначалі таксама значную ролю семінарскіх і лабараторных заняткаў, пошукавых заданняў для развіцця самастойнасці.

Важнай задачай выкладчыкаў з'яўляецца навучыць студэнтаў вучыцца. У гэтым кірунку асаблівае значэнне набывае ўменне работы з літаратурай і рознымі іншымі крыніцамі. На факультэце ўжо склалася пэўная сістэма падрыхтоўкі студэнтаў у названым кірунку: акрамя курса "Уводзіны ў спецыяльнасць", выкладаецца "Інфармацыйная культура спецыяліста", дзе значная ўвага надаецца фарміраванню ўменняў і навыкаў работы з інфармацыйнымі крыніцамі, аналітыка-сінтэтычнай іх перапрацоўцы. Вывучаецца дысцыпліна "Асновы НДР". Выкладчык ва ўводнай лекцыі акцэнтуе ўвагу на формах самастойнай работы па курсу і іх асаблівасцях.

Добра ўплываюць на матывацыйную накіраванасць і на вынікі самастойнай работы творчыя, пошукавыя заданні, іншы раз яны бываюць асобасна арыентаваныя. Напрыклад, прафесар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А.П.Грыцкевіч прапануе студэнтам распрацоўку ўласных радаводаў, для чаго студэнты вывучаюць дакументы сямейнага архіва, распытваюць сваякоў. Па курсу "Абслугоўванне чытачоў па краязнаўстве" (праф. Л.А.Дзямешка) студэнты V курса распрацавалі аўтарскія вандроўкі па родных мясцінах (Слуцк, Смаргонь, Міёры і інш.). І пералік такіх заданняў можна працягнуць.

Мы імкнуліся высветліць, як студэнты ацэньваюць узровень забяспечанасці самастойнай работы метадычнымі рэкамендацыямі, літаратурай, электроннымі інфармацыйнымі рэсурсамі, як ім дапамагаюць выкладчыкі і бібліятэкары. Большасць студэнтаў III курса (67%) лічаць, што самастойная работа забяспечана метадычнымі дапаможнікамі на 25-50%. Чацвёртакурснікі задаволены значна менш: больш за палову (54%) адзначаюць, што метадычнымі дапаможнікамі яны забяспечаны толькі на чвэрць ад патрэбнага ўзроўню.

Забяспечанасць іншай літаратурай для самастойнай работы знаходзіцца, на думку студэнтаў, у некалькі лепшым стане. Каля 40% студэнтаў задаволены напалову, 15% лічаць, што на 75% наяўнасць літарутуры адпавядае патрэбам, поўнасцю задаволены толькі 3%, а зусім не задаволены 4% апытаных. Што тычыцца электронных рэсурсаў, для паловы студэнтаў іх або зусім няма (49%), або ёсць толькі чвэрць ад патрэбнага (32%). Толькі 7% апытаных цалкам задаволены, большасць з іх вучыцца на трэцім курсе.

На ФІДК ёсць станоўчы вопыт па забеспячэнні самастойнай работы вучэбнымі дапаможнікамі, метадычнымі распрацоўкамі. За 2001-2003 гг. выдадзены і падрыхтаваны да друку вучэбныя дапаможнікі "Інфармацыйная культура асобы" (дац.Т.В.Кузьмініч), "Гісторыя сусветнай бібліяграфіі"(дац.В.І.Саітава), "Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы" (дац.С.В.Зыгмантовіч) і інш. Усяго выдадзены 5 вучэбных дапаможнікаў, падрыхтаваны да друку яшчэ 5.

Матывацыя дзейнасці, у тым ліку і самастойнай, падмацоўваецца яе паспяховасцю. Тое, што добра атрымліваецца, чалавек у далейшым выконвае яшчэ з большым задавальненнем. Таму вельмі важныя кантроль за самастойнай работай студэнтаў, індывідуальная ацэнка працы навучэнца. Для студэнтаў мае вялікае значэнне ацэнка іх работы выкладчыкам. Гэтая работа, на жаль, не заўсёды эфектыўная, бо патрабуе пэўных затрат часу, які не выдзяляецца вучэбным аддзелам і не плануецца ў індывідуальных планах выкладчыкаў. Адсутнасць рэгламентацыі зносін паміж студэнтам і выкладчыкам у працэсе выканання самастойнай работы – слабае месца ў яе арганізацыі.

Не выпадкова, што дапамогай выкладчыкаў цалкам задаволены толькі каля 4% апытаных, амаль што задаволены – 16%, напалову задаволены – 47%. Што ж тычыцца дапамогі бібліятэкараў, тут 54% задаволены ёю толькі на чвэрць, а 8% – наогул не задаволены.

Калі паспрабаваць ранжыраваць ступень незадаволенасці студэнтаў забяспечанасцю самастойнай работы па розных параметрах, можна адзначыць, што ў найменшай ступені яны задаволены электроннымі інфармацыйнымі рэсурсамі (81% адзначылі слабую забяспечанасць), на другім месцы па незадаволенасці – дапамога бібліятэкараў (62% адзначылі яе слабы ўзровень), затым ідуць метадычныя дапаможнікі (37%), дапамога выкладчыкаў (32%) і наяўнасць літаратуры (29%).

Пры выкананні самастойнай работы студэнты часцей за ўсё звяртаюцца ў бібліятэку універсітэта (85%), 40% з іх нярэдка, або заўсёды, карыстаюцца Нацыянальнай бібліятэкай, у абласную бібліятэку звяртаецца нязначная колькасць апытаных.

Цікава было даведацца, як ацэньваюць студэнты ўзровень арганізацыі самастойнай работы па асобных дысцыплінах. Сярод курсаў, дзе гэта работа арганізавана добра, студэнты III курса назвалі як сацыяльна-гуманітарныя, так і спецыяльныя дысцыпліны, але перавага аддаецца сацыяльна-гуманітарным. Паліталогію адзначылі 50%, педагогіку – 38%, культуралогію – 35%. Сярод

спецыяльных дысцыплін назвалі арганізацыю і тэхналогію бібліяграфічнай работы (29%), гісторыю сусветнай бібліяграфіі (11%).

Сярод дысцыплін з невысокім узроўнем арганізацыі самастойнай работы названы "Правы чалавека", "Эканамічная тэорыя", "Матэматычныя метады бібліятэчнай работы", "Бібліятэчныя фонды".

У адрозненне ад трэцякурснікаў студэнты IV курса ў асноўным гаварылі аб спецыяльных дысцыплінах. Прычым адчуваўся пэўны суб'ектывізм у ацэнцы ўзроўню арганізацыі самастойнай работы. Некаторыя курсы ацэньваліся адными студэнтамі станоўча, другімі – адмоўна. Характэрна, што студэнты называлі не толькі курсы з высокім узроўнем арганізацыі самастойнай работы, але і выкладчыкаў, чыя дзейнасць стымулюе гэтую работу, напрыклад, В.А.Грачову, І.А.Царык, В.М.Бігезу.

Па ўдасканаленні арганізацыі самастойнай работы студэнты выказалі і шэраг слушных прапаноў:

– палепшыць арганізацыю вучэбнага працэсу (перайсці на першую змену навучання, зменшыць аўдыторную нагрузку, зрабіць больш працяглым час паміж семінарамі, павялічыць колькасць гадзін на практыку);

– значна ўдасканаліць работу бібліятэкі (лепш камплектаваць яе фонд спецыяльнай літаратурай, павялічыць колькасць падручнікаў на абанеменце, падоўжыць работу кнігасховішча, палепшыць адносіны некаторых бібліятэкараў да студэнтаў);

– зрабіць больш даступным для студэнтаў інтэрнет (арганізаваць камп'ютэрны клуб, доступ у камп'ютэрныя лабараторыі);

– звярнуць увагу на арганізацыю самастойнай работы (узгадніць у рамках факультэта графік кантролю за самастойнай работай па розных дысцыплінах, выдзеліць адзін дзень у тыдзень для самастойнай работы, больш прапаноўваць творчых заданняў, часцей праводзіць кантрольныя работы, заняткі-дыскусіі, тэст-апытанні, больш поўна даваць тэксты лекцый, лепш забяспечыць самастойную работу падручнікамі і метадычнымі дапаможнікамі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пры рэкамендацыі літаратуры арыентавацца на склад фонду бібліятэкі універсітэта).

Вынікі апытання паказалі, што студэнты зацікаўлены ва ўдасканаленні працэсу самастойнага набыцця ведаў і надаюць вялікае значэнне стымулюючай ролі кантролю за самастойнай работай. Сённяшніх студэнтаў не задавальняе моцны, на іх погляд, псіхалагічны прэсінг фармальнага кантролю, не падабаецца "татальнасць" кантролю, а іншы раз "беглы", пяціхвілінны кантроль.

Адпаведнае інфармацыйнае і метадычнае забеспячэнне самастойнай работы студэнтаў, аптымізацыя педагагічных стасункаў з выкладчыкамі, заахвочванне творчага падыходу да набыцця ведаў, стварэнне станоўчай матывацыі, аб'ектыўнасць і своечасовасць кантролю дазволяць надаць самастойнай рабоце той статус, які яна павінна займаць у сучаснай сістэме падрыхтоўкі спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ